*Наталля Матыліцкая*

## З ГІСТОРЫІ ДАСЛЕДАВАННЯ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАГА ФАЛЬКЛОРУ СЛУЧЧЫНЫ

Нягледзячы на наяўнасць сабранага на тэрыторыі Случчыны экспедыцыйнага матэрыялу, да яе традыцыйнай спадчыны дагэтуль не было пільнай увагі даследчыкаў. Франтальнае абследаванне гэтай тэрыторыі на прадмет збору фальклорнага матэрыялу не праводзілася. Запісы носяць разрозненны характар: экспедыцыі прадпрынятыя выпадковымі людзьмі, рэдка спецыялістамі па фальклоры і носяць неўпарадкаваны характар – не абгрунтаваны выбар месцаў запісу. Не было і сур'ёзных спробаў навуковага тэарэтычнага аналізу гэтых матэрыялаў. На фоне заўважнай цікавасці да Палесся, якому прысвечаны навуковыя даследаванні не толькі беларускіх фалькларыстаў, але і расіян, цікавасці крыху ў меншай ступені да Паазер'я, Цэнтральная Беларусь, а з ёю і Случчына, знаходзіцца «ў цяні» гэтых рэгіёнаў. Увага даследчыкаў найперш да Палесся тлумачыцца лепшай захаванасцю тут фальклорнага матэрыялу. Каляндарна-абрадавы фальклор Случчыны знаходзіцца ўжо ў рэліктавым стане, таму надзвычай своечасовай з'яўляецца задача даследавання мясцовых узораў. Аналіз сабраных матэрыялаў, на нашу думку, дасць магчымасць прыцягнення ўвагі фалькларыстаў да збірання найперш тых матэрыялаў, якія маюць патрэбу ў неадкладнай фіксацыі.

Феномен Случчыны прыцягваў увагу навукоўцаў да збірання тут фальклорных матэрыялаў на працягу XIX–XX стст. Адным з першых у XIX ст. гэта пачаў рабіць Зарыян Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі), які сам сябе называў «случаком», хаця нарадзіўся на Лагойшчыне. Яго цікавасць была абумоўлена гасцяваннем у свайго багатага сваяка Казіміра Чарноцкага ў вёсцы Лецяшын Слуцкага павета, потым вучобай у Слуцкім павятовым вучылішчы. У 1819 годзе З. Даленга-Хадакоўскі неаднаразова пісаў да знаёмых і сваякоў на Случчыну, каб збіралі і дасылалі яму пераважна абрадавыя песні – «вясельныя, калядныя, купальскія, русальныя, запусныя», бо, як ён тлумачыць, «у вас (на Случчыне каля Клецка) **Крывічане, або Русь Чорная**, былі першапачаткова, пагэтаму тыя ж паданні павінны быць у вас, што і ў іншых мясцовасцях. Уся старажытнасць захавалася ў іх». На жаль, яго запісы беларускіх песень не былі апублікаваны, але мы можам гіпатэтычна сцвярджаць, што сярод іх знаходзіліся і ўзоры слуцкай каляндарна-абрадавай паэзіі.

Першыя публікацыі каляндарна-абрадавых песень са Слуцкага павета (адной шчадроўкі і дзвюх валачобных песень) мы сустракаем у 1874 годзе ў зборніку «Беларускія народныя песні» П. Шэйна. Сюжэтная сітуацыя шчадроўкі *дыялог хлопца з канём* вядома ў некалькіх варыянтах на Заходнім Палессі (Пружаншчына), а вышэйузгаданая публікацыя – адзіны запіс сюжэту са Случчыны. У зборніку ўпершыню апублікаваная адметная рэгіянальная версія валачобнай сюжэтнай сітуацыі *разбурэнне гаспадарскага двара шурай-бурай*, а ў другой песні ўтрымліваецца слуцкі адметны абрадавы тэрмін – «кукольнікі» (лакальная назва валачобнікаў). У наступным выданні П. Шэйна «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края» (1887) апублікаваны 2 калядныя, 1 валачобная, 1 юраўская, 1 купальская і 13 жніўных песень, словы і апісанне клікання марозу на куццю са Слуцкага павета з вёсак Карацк (цяпер вёска ў Клецкім р.) і Падлессе (цяпер вёска ў Ляхавіцкім р.), апісанне каляднай гульні «Ката пячы» з Клецкай воласці.

Пра звычай святкавання Вялікадня ў в. Канюхі Слуцкага павета (цяпер Капыльскі раён) падаў звесткі «Календарь Северо-Западного края» за 1889 год. Мы бачым, што ў гэтай вёсцы, як і ў многіх іншых вёсках Случчыны валачобнікаў называюць кукольнікамі. Спевы кукольнікаў суправаджаліся інструментальнымі наігрышамі на скрыпцы і бубне. У нарысе прыводзіцца фрагмент шырокавядомай на Случчыне велікоднай песні хрысціянскай тэматыкі: «На першы дзень Вялікдзень / Маці сына нарадзіла / Алелюя, алелюя, алелюя», 2 фрагменты песень і прыгаворак з просьбай дароў, указанне на тое, што спяваліся велічальныя песні для маладых дачкі і сына гаспадароў, тэксты якіх, на жаль, не прыводзяцца.

Пра святкаванне Купалля ў в. Вуглы Слуцкага павета (цяпер Капыльскі раён) распавядаў нарыс «Іван Купала» ў «Этнаграфічным зборніку» (1891 г.). Аўтар П. Бывалькевіч апісваў элемент абраду, які не зафіксаваны ў іншых мясцінах Случчыны, напрыклад, спальванне дзяўчатамі бярозак, што засталіся ад абраду Тройцы, на купальскім вогнішчы, якое ладзіцца на скрыжаванні дарог. Цікавым з'уляецца і прыведзенае аўтарам дэманалагічнае павер'е пра тое, што жабы і іншыя гады складаюць світу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведзьмаў, а пры дапамозе некаторых жабаў, якіх называюць рапухамі, ведзьмы адбіраюць у кароў малако. Гэтыя ўяўленні аўтар суадносіць з прыведзенай купальскай песняй, у якой міфічны Купала з'яўляецца змагаром з нячыстай сілай: «Да йшло Купала сялом, сялом / Да забіла жабу калом, калом». Каштоўным з'яўляецца і сведчанне пра ўтырканне асінавых галінак на палях «каб ведзьмы не аднялі спор (ураджай)», менавіта таму асіне надаецца такая магічная сіла, бо згодна з другім міфам, «калі Дабрыня Мікіціч забіў змея, ён павесіў яго на асіну, ад чаго той не мог ажыць». Мы бачым семантычны дахрысціянскі папярэднік павер'я, якое ўзнікла ў хрысціянскі час пра павешанне Іуды на асіне. Аўтар у нарысе прыводзіць словы шырока вядомай на Случчыне варажбы з трыпутнікам на Купалле. Сярод пяці прыведзеных тэкстаў унікальнай з'уляецца песня, якая спявалася перад хатаю нежанатага хлопца з тыповым матывам «гняздо чмялёў у хмелі», што абазначае «перашкоду ў жаніцьбе». Аўтар робіць каштоўнае назіранне пра прычыны захаванасці абраду Купалля менавіта ў гэтай вёсцы: «Вёска Вуглы ў той час уяўляла сабой адзінае месца (з усіх суседніх вёсак) у Слуцкім павеце, дзе яшчэ захоўваўся старажытны звычай святкавання Купалы. Яна стаяла ў баку ад вялікіх дарог».

Першым спецыяльным выданнем, якое ўтрымлівае матэрыялы з тэрыторыі Случчыны, а менавіта яе паўночна-заходняй часткі з'явіўся зборнік «Беларускія народныя песні» С. Малевіча (1907), матэрыялы для якога збіраліся ў кампактна размешчаных вёсках Малева, Альхоўка, Яськевічы, Гусакі, Карцавічы (цяпер Нясвіжскі раён). Каляндарна-абрадавая паэзія ў зборніку прадстаўлена «шчадрэцкімі», «вясеннімі», «купальнымі», «летнімі» песнямі. Каштоўнасць гэтага выдання павялічваецца ад таго, што аўтар збіраў матэрыял на працягу некалькіх гадоў. Гэта паспрыяла больш дакладнай і поўнай фіксацыі не толькі тэкстаў песень, але і перадачы дыялектных асаблівасцяў мясцовай гаворкі. Адна з трох шчадровак утрымлівае шырокавядомы матыў «тры надобкі для паненкі», які на Случчыне сустракаецца і ў валачобных песнях. Другая – каштоўная найбольш поўным варыянтам песні падчас танца «Казы», дзе прысутнічаюць вобразы дзеда, стральцоў, ваўчка, якія палююць на казу. Трэці сюжэт шчадроўкі на хрысціянскую тэму – «Лукаш анялісты муляваў вобраз панны чыстай» – быў распаўсюджаны ў асяроддзі каталіцкага насельніцтва, аб чым сведчыць наяўнасць паланізмаў у тэксце. Цікавыя сюжэты і некаторых астатніх песень календара. Выключэнне складае толькі адна з песень, аднесеная даследчыкам да веснавых «Ой, лёд трашчыць», але якая, відавочна, з'яўляецца вядомым творам расійскага фальклору «Вдоль по Питерской». Дарэчы, пра шляхі адсочвання некаторых праўнесеных элементаў у беларускую традыцыю піша сам збіральнік у прадмове да кнігі: «Народная песня знікае з вёскі, замяняючыся часцей за ўсё пазнейшай наноснай, больш або менш легкадумнай песенькай гарадскога пашыбу».

Найбагата прадстаўлены запісы з тэрыторыі Случчыны: 39 тэкстаў каляндарна-абрадавых песень заходняй часткі Случчыны (сучасныя вёскі Яжэвічы, Залешаны Клецкага, в.Шчаснавічы Ляхавіцкага раёнаў), дасланых Казімірам Чарноцкім – пляменнікам З. Даленгі-Хадакоўскага, у пятым і сёмым томе працы «Люду беларускага» (Т. 1–8, 1897–1981) М. Федароўскага. У зборніку прадстаўлены купальскія (20) і жніўныя (15), сустракаюцца адзінкавыя запісы валачобных, юраўскіх, пятроўскіх песень. Колькасная перавага купальскіх і жніўных песень, у параўнанні з іншымі каляндарна-абрадавымі песнямі, на ўзгаданай тэрыторыі Случчыны, была пацверджана больш познімі запісамі, зробленымі фалькларыстамі ў другой палове XX стагоддзя.

Да 1920-х гадоў на Случчыне наладзілася краязнаўчая праца. Спачатку, з 1918 года – сябрамі культурна-асветнага таварыства «Папараць-кветка», з 1925 года – Слуцкім Акруговым Таварыствам Краязнаўства, этнаграфічна-эканамічная секцыя якога сабрала «300 песень і казак Случчыны». З 1927 года рэарганізаванае Слуцкае Раённа-Гарадское Таварыства Краязнаўства «даслала ў ЦБК 150 адзінак фальклору». Адным з самых цікавых і плённых відаў працы слуцкіх краязнаўцаў былі экспедыцыі («падарожы»). За 5 экспедыцый пройдзена 699 вёрст па Случчыне. Каштоўнымі з'яўляюцца звесткі пра наяўнасць у Слуцкім раёне масленічных песень, бо цяпер яны амаль не сустракаюцца. Сябрам таварыства ўдалося запісаць шмат старых звычаяў, у тым ліку: абрад провадаў Масленкі (в. Чапялі, цяпер Салігорскі раён), юраўскія і перадвелікодныя песні, купальская абрадавая варажба дзяўчат.

Некалькі каляндарна-абрадавых песень са Случчыны патрапілі ў трэці том зборніка Рыгора Шырмы «Беларускія народныя песні» (1962). Запісы былі зроблены яшчэ ў 1920-1930-я гады – валачобная і шчадроўская з вёсак Лань і Лявонавічы Нясвіжскага р-на. Некалькі песень запісаны Шырмам ад вядомага пісьменніка Случчыны, Максіма Лужаніна – 2 калядкі, 2 юраўскія, 1 жніўная.

Вельмі плённай была слуцка-пінская экспедыцыя 1946 годзе ў вёскі Бялевічы, Заўшыцы, Сяльцо, Крывічы, Чапялі Старобінскага р-на (сучасны Салігорскі р-н) і Казловічы, Працавічы Слуцкага р-на, у якой прымалі ўдзел Г. Цітовіч, М. Грынблат, В. Коўчур. Пераважна былі зроблены апісанні абрадавых святкаванняў Калядаў, Шчадраца, Стрэчання, Благавешчання, Вялікадня, Юрэя (Ю'рэй), Тройцы, Купалы, але і таксама некаторых каляндарна-абрадавых песень: шчадровак, веснавых карагодных, зажынкавых, жніўных, касарскіх і восеньскіх. Генадзю Цітовічу належыць запіс такой лакальнай з'явы, як веснавая карагодная песня «Пчолачка».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ